# НЕ ЗДРАДЖВАЦЬ РАЗВАЖНАМУ СЭНСУ

## Наш субяседнік—член Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі А. А. МАЛАФЕЕЎ



**— Нягледзячы на ўсе перыпетыі, Беларусь захоўвае ў краіне рэпутацыю рэспублікі, дзе не спяшаюцца з гучным словам, ведаюць і ўмеюць весці справу, цэняць парадак і добрасуседства. А якой бачыцца эканамічная, грамадска-палітычная сітуацыя ў БССР, так сказаць, знутры, а не па чутках?**

— Задзел, напрацаваны ў папярэднія гады, даў магчымасць не толькі змякчыць негатыўныя тэндэнцыі, але і адаліць напружанасць на спажывецкім рынку ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі краіны. Аднак у другой палавіне мінулага года становішча рэзка пагоршылася. Далі аб сабе знаць разрыў гаспадарчых сувязей, узмацненне эканамічнага сепаратызму, рэгіянальнага эгаізму, значныя недапастаўкі сыравіны, матэрыялаў, камплектуючых вырабаў. Арытмія вытворчасці нарастае.

Складанасці эканамічнага плана ўзмацняюцца праблемамі палітычнымі, духоўнымі. Напрыклад, вельмі востра стаяць пытанні адраджэння нацыянальнай мовы і культуры, экалогіі і суверэнітэту. Апазіцыйныя сілы спрабуюць выкарыстаць гэтыя акалічнасці для стварэння абстаноўкі жорсткага процістаяння, нервовасці, стараюцца паказаць кіраўнікоў партыйных і савецкіх органаў кансерватарамі, не здольнымі ўспрымаць новае.

Праўда ж, аднак, заключаецца ў тым, што мы не слепа ішлі за тымі ці іншымі падзеямі, якія бурна развіваліся ў краіне, а няўхільна і паслядоўна праводзілі сваю лінію. Магчыма, таму ўдалося захаваць адносна стабільную абстаноўку, не дапусціць нацыянальнай варожасці, сутыкненняў. Не забудзьце, на ўсіх без выключэння баках жыцця адбіваюцца вынікі буйнейшай катастрофы XX стагоддзя.

**— Такім чынам, у будучыню глядзіце з аптымізмам?**

— Так, калі, зразумела, усе мы будзем з разважным сэнсам ставіцца да сваіх учынкаў, імкнуцца не цешыць свае амбіцыі, а працаваць для працвітання рэспублікі і свайго народа. Вельмі важна захаваць абноўлены Саюз. Да гэтага, дарэчы, заклікаў XXXI з'езд КПБ. Асаблівы ўпор цяпер робім на аптымальныя, навукова абгрунтаваныя прынцыпы Саюзнага дагавора. Разам з гэтым думаем над праграмай, якая ўлічвала б асаблівасці сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў БССР.

**— Якая ў яе распрацоўцы і ажыццяўленні роля кампартыі рэспублікі?**

— Модным стала сцвярджэнне: партыйныя камітэты павінны выдаваць на-гара свае альтэрнатыўныя праграмы і прадстаўляць іх на разгляд дзяржаўных органаў. Але давайце разбяромся. У адносінах да чаго такія праграмы павінны быць альтэрнатыўнымі? Да прапаноў, якія афіцыяльна вылучаюцца ад імя, скажам, урада рэспублікі? Аднак Кабінет міністраў складаецца пераважна з камуністаў. І яго дзеянні, хочам мы таго ці не, у вачах людзей асацыіруюцца з дзеяннямі партыі. Так што займаць тут пазіцыю пабочнага назіральніка было б няправільна. КПБ у цэлым як кіруючая партыя і яе Цэнтральны Камітэт у прыватнасці павінны прымаць адказнасць на сябе за дзеянні Саўміна. Разам з тым мы не павінны саромецца кантраляваць гэты ўрад і, калі трэба, папраўляць яго.

Менавіта гэтыя пазіцыі закладзены ў антыкрызісную праграму XXXI з'езда КПБ. Ён дакладна выказаўся за рэгулюемы рынак і захаванне сацыялістычнага ўкладу эканомікі. За тое, каб першарадная ўвага ўдзялялася сацыяльнай абароне працоўных, паляпшэнню забеспячэння прадуктамі харчавання на аснове прыярытэтнага развіцця сельскай гаспадаркі.

**— Мы заўважылі, з якой цеплынёй, удзелам і падтрымкай паставіліся дэлегаты з'езда да прадстаўнікоў літоўскіх камуністаў. Якія вывады, урокі зрабіла для сябе КПБ, аналізуючы прыбалтыйскі варыянт перабудовы?**

— Яго нельга, вядома, разглядаць без уліку перамен, якія адбываюцца ў краіне, а таксама ізалявана ад працэсаў ва Усходняй Еўропе. Раскол і драбленне камуністычных партый трох суседніх рэспублік аслабілі іх палітычныя пазіцыі. Таму кансалідацыю партыйных сіл мы вызначылі адным з важнейшых напрамкаў сваёй дзейнасці. Яшчэ вывад: камуністы павінны старанна пралічваць не толькі свае крокі, але і дзеянні апанентаў. Кампрамісы з імі магчымы тады, калі яны не наносяць урону партыі, справе сацыялізму.

Драматычныя падзеі ў Прыбалтыцы яшчэ раз напамінаюць аб тым, наколькі важна ўзважана падыходзіць да вырашэння міжнацыянальных пытанняў, паважаць Канстытуцыю СССР, іншыя савецкія законы, любыя канфлікты здымаць палітычнымі метадамі.

Рэалізуючы нават самыя прывабныя ідэі, неабходна дакладна прагназіраваць сацыяльна-эканамічныя вынікі, своечасова аналізаваць іх «уваходжанне» ў жыццё. Уносіць адпаведныя карэктывы ў першапачатковую задуму. Гэта нялёгкая справа. Таму ў якасці першачарговай намі вылучана задача павышэння ідэйна-тэарэтычнага, інтэлектуальнага патэнцыялу кадраў Кампартыі Беларусі.

**— Адны гавораць: «Партыя адступае». Другія: «Дрэнна працуе...» А ваша філасофія партыйнай работы ў сучасных умовах?**

— Мне здаецца, такія фармуліроўкі ідуць у большай ступені ад ранейшых уяўленняў аб ролі КПСС у грамадстве, яе функцыях. Практыка, калі, скажам, райком непасрэдна ўмешваўся ў размеркаванне камбікармоў, беззваротна адышла ў мінулае. Але я не скажу, быццам на яе месца ўжо прыйшло дакладнае разуменне таго, што павінны рабіць нашы структуры.

Мне асабіста партыйная работа бачыцца арганічным сінтэзам двух глыбока ўзаемазвязаных спосабаў чалавечай дзейнасці: тэарэтычнай і канкрэтна-практычнай. Неабходна ў поўнай меры ўключыць інтэлектуальны патэнцыял КПСС у мэтах творчага абагачэння і развіцця яе дзейнасці. Жыццё настойліва вылучыла патрабаванне адмовіцца ад кабінетных метадаў работы. Не выпадкова ж нашымі ідэйнымі праціўнікамі пушчаны ў ход тэрмін: «партыя кабінетнага тыпу». А самі яны не сядзяць у офісах, ідуць непасрэдна ў працоўныя калектывы, па месцы жыхарства людзей і імкнуцца заваяваць сабе прыхільнікаў. У такой абстаноўцы мы проста абавязаны дзейнічаць па-новаму.

**— Аднак, Анатоль Аляксандравіч, аб гэтым пакуль ідуць толькі размовы. Дзе ж вопыт такой работы?**

— Вы маеце рацыю, аб ім гаварыць сёння не прыходзіцца. Вельмі доўга, на жаль, мы раскачваемся, не можам ніяк упісацца ў інтэнсіўны дэмакратычны працэс, які ідзе па ўсёй краіне, у тым ліку і ў нашай рэспубліцы. Кантакты новых сакратароў, загадчыкаў аддзелаў, членаў ЦК з працоўнымі пакуль толькі пачатак гэтай велізарнай работы.

Нядаўна, напрыклад, я пабываў на трактарным заводзе. Убачыў тое, што, уласна, ведаў і да таго: нарастанне сур'ёзных жыццёвых праблем выклікала ў людзей вельмі напружаныя адносіны да ўсіх кіруючых структур. З усіх бакоў патрабуюць навядзення парадку, заснаванага на павазе грамадства да права. У гарачых размовах кожнай клетачкай скуры адчуваеш, чым жыве народ. І чым усё можа абярнуцца, калі ў бліжэйшы час не ўдасца стабілізаваць абстаноўку, палепшыць жыццё людзей. Без дыялога, няхай крайне складанага і цяжкага, з усімі слаямі насельніцтва, з рознымі палітычнымі рухамі нам, камуністам, не аднавіць давер да сябе. І ўжо ні ў якім выпадку мы не павінны ісці на процістаянне. Гэта — тупік.

**— Не баіцеся, што вас «занясуць» у разрад кансерватараў?**

— Аб сваёй пазіцыі я дастаткова дакладна выказаўся на мінулым З'ездзе народных дэпутатаў СССР. І паўтару, што не належу ні да «правых», ні да «левых», ні да «цэнтрыстаў». Мой «бог» — разважны сэнс і чыстае сумленне. Нашы партыйныя дзверы адчынены прадстаўнікам усіх грамадскіх плыней, для якіх інтарэсы беларускага народа — не дэмагагічны сродак у барацьбе за ўладу і ўплыў.

**—Ці не таму вас, Анатоль Аляксандравіч, можна ўбачыць за гутаркай і з лідэрам Народнага фронта рэспублікі Пазняком, і з мітрапалітам Філарэтам?.. Але ж ранейшае кіраўніцтва, як вядома, грамадска-палітычным рухам не ўдзяляла столькі ўвагі. І сёння ў такой пазіцыі нямала прыхільнікаў. Вы спадзяецеся, што ўдасца прымірыць непрымірымае?**

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы